# КОНФЕССИОНАЛЬНЫЕ И ЭТНИЧЕСКИЕ ОТНОШЕНИЯ И СВОБОДА СОВЕСТИ

УДК 2:37

*А.Р. Агееў (г. Магілеў, Беларусь)*

## РЭЛІГІЙНАЯ АДУКАЦЫЯ І АТЭІСТЫЧНАЯ ПРАПАГАНДА Ў ПЕРШАЕ ДЗЕСЯЦІГОДДЗЕ ГІСТОРЫІ МДУ ІМЯ А.А. КУЛЯШОВА

У першае дзесяцігоддзе гісторыі МДУ ярка выявілася агульная тэндэнцыя замены існаваўшай да рэвалюцыі 1917 г. у Расійскай імперыі рэлігійнай адукацыі савецкай атэістычнай прапагандай. Погляд на "малекулярным узроўні" дазваляе выявіць асаблівасці, зразумець механізмы рэалізацыі тых ці іншых рашэнняў, абвергнуць, або пацвердзіць сталыя погляды.

Летам 1913 г. у Магілёве быў адкрыты настаўніцкі інстытут "з гарадскім пры ім вучылішчам". Правілы паступлення, пералік уступных экзаменаў і іх праграм былі зацверджаныя па ўзоры Віленскага хрысціянскага, Маскоўскага і Віцебскага настаўніцкіх інстытутаў. Магілёўскі інстытут не называўся хрысціянскімі, але яго праваслаўная даміната выяўлялася ўжо ў правілах для паступаючых. Да ўступных экзаменаў дапускаліся асобы выключна мужчынскага полу праваслаўнага веравызнання. Прашэнне настаўніка Матта Адова Лілліпа "евангелічна-лютэранскага веравызнання" аб "дапушчэнні да прыёмных у інстытут выпрабаванняў" было ў жніўні 1913 г. па прапанове дырэктара У. Тычыніна адхілена Упраўленнем Віленскай вучэбнай акругі. Усе першыя студэнты Магілёўскага настаўніцкага інстытута па сваім веравызнанні былі праваслаўнымі. У гарадскім вучылішчы вучыўся адзін рыма-каталік. [1, с. 19, 24]

Для яўрэяў з 1875 г. ў Вільне існаваў яўрэйскі настаўніцкі інстытут, куды прымаліся мужчыны іудзейскага веравызнання. У іншыя настаўніцкія інстытуты іх не прымалі.. У цыркуляры ад 4 студзеня 1914 г. начальнікам сярэдніх навучальных устаноў катэгарычна патрабавалася адлічыць яўрэяў, якія пад відам прыняцця хрысціянства, прадставіўшы падробленыя пасведчанні пастара Г. Піра паступілі ў навучальныя ўстановы. [5, арк. 22]

Пры паступленні абітурыентам неабходна было прайсці медыцынскі агляд, напісаць 3 пісьмовыя работы і здаць вусныя іспыты па дзевяці прадметах. Першай сярод вусных іспытаў была здача Закона Божага. Паступаўшыя ў гарадское вучылішча здавалі Закон Божы, дыктоўку і пераказ на рускай мове, арыфметыку (пісьмова і вусна), царкоўнаславянскую мову, геаграфію і гісторыю – 8 іспытаў.

Дзейнасць свецкага інстытута была пранізана царкоўнымі сімваламі і абрадамі. Дзень заснавання настаўніцкага інстытута 1 ліпеня – дзень памяці бяссрэбранікаў Касьмы і Даміана быў спрыяльным для вучобы. Навучэнцы яшчэ ў XVII стагоддзі малілі бяссрэбранікаў "аб прасвятленні розуму да вучэння грамаце". Урачыстае адкрыццё інстытута адбылося 1 кастрычніка 1913 г. Па завяршэнні ў адной з бліжэйшых прыходскіх цэркваў Божай літургіі ў актавай зале інстытута адбыўся малебен Пакрова Прасвятой Багародзіцы. Законавучыцель святар Гамолка здзейсніў асвячэнне ўсяго будынка святой вадою. Дырэктар У.М. Тычынін звярнуўся да прысутных з прамовай, якую завяршыў заклікам: "Боже, Царя храни!", на "што выхаванцы адказалі зладжаным і натхнёным спяваннем гімна". [2]

Рэлігійнасці жыцця інстытута спрыяў і асабовы састаў служачых установы. У 1913 г. калектыў складаўся з 14 чалавек, у тым ліку 1 – законавучыцеля. Дырэктар інстытута стацкі саветнік кандыдат маскоўскай духоўнай акадэміі Уладзімір Мікалаевіч Тычынін быў у 1913 г. чыноўнікам 5 класа. На службу ён паступіў яшчэ 14 студзеня 1889 года і быў ужо ўзнагароджаны ардэнамі св. Ганны 2-й і 3-й ступеняў, св. Станіслава 2-й і 3-й ступеняў,

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

бібліяй ад Святога Сіноду, залатым знакам Чырвонага крыжа, залатым і бронзавым знакамі Імператарскага Палесцінскага праваслаўнага таварыства.

Першым законавучыцелем інстытута быў прызначаны свяшчэннік Мікалай Азар'явіч Гамолка. У 1901 г. ён скончыў курс С.- Пецярбургскай духоўнай акадэміі з ступенню кандыдата багаслоўя "з правам атрымання ступені магістра багаслоўя без новых вусных іспытаў". У гэтым жа годзе М. Гамолка стаў памочнікам інспектара ў Магілёўскай духоўнай семінарыі, а з 1903 г. выкладаў матэматыку і фізіку ў Магілёўскім жаночым духоўным вучылішчы. Ён быў жанаты, меў сына і дачку. Да моманту прыходу ў інстытут прайшоў шлях ад тытулярнага саветніка ў 1906 г., калежскага асэсара ў 1909 г., да надворнага саветніка ў 1910 г. і быў узнагароджаны ардэнамі св. Ганны 3-й ступеняў і св.Станіслава 3-й ступеняў. Законавучыцелем ён быў прызначаны пры ўмове прыняцця свяшчэннага сану. Фактычна Гамолка быў другой асобай у інстытуце. На час адлучак Тычыніна менавіта ён выконваў у 1913 – 1914 гг. абавязкі дырэктара. У ліпені 1914 г. па яго просьбе ён быў пераведзены ў Мінскі настаўніцкі інстытут. [3, арк. 43 – 66; 4, арк. 2]

У лістападзе 1914 г. папячыцель Віленскай вучэбнай акругі часова прызначыў выкладаць "Закон Божы" ў настаўніцкі інстытут выкладчыка Магілёўскай духоўнай семінарыі свяшчэнніка Васіля Маркава, а ў гарадское пры інстытуце вучылішча свяшчэнніка Вазнясенскай царквы Пятра Дамарацкага, якія і працавалі на гэтых пасадах да жніўня 1916 г. [6, арк. 3 – 4]

Рускую мову ў інстытуце выкладаў таксама кандыдат багаслоўя Маскоўскай духоўнай акадэміі, надворны саветнік, чыноўнік 8-га класа Віталій Паўлавіч Сакалоў. Ён паступіў на службу 26 жніўня 1909 года і да інстытута працаваў у Мінскай духоўнай семінарыі.

Рэвалюцыя 1917 г. прывяла да кардынальных пераўтварэнняў у грамадстве, у тым ліку і ў сферы адукацыі. Ужо ўлетку Часовы ўрад прыступіў да ліквідацыі нацыянальных, рэлігійных, сацыяльных абмежаванняў у вобласці адукацыі, у тым ліку дазволіў прымаць у навучальныя ўстановы асоб абоега полу.

У сакавіку 1918 г. горад Магілёў быў заняты польскімі войскамі, а ў маі – германскімі ўзброенымі фарміраваннямі. Адміністрацыя інстытута цяпер ўзгадняла свае рашэнні з новымі ўладамі. Так, у ліпені 1918 г. адміністрацыя інстытута, які знаходзіўся ў акупаваным немцамі горадзе, запрашвала упраўленне Віленскага навучальнай акругі аб магчымасці паступлення яўрэяў у "праваслаўны настаўніцкі інстытут".

Напрыканцы 1918 г. пасля ўсталявання савецкай улады ў адпаведнасці з пастановай Усерасійскага з'езду работнікаў настаўніцкіх інстытутаў настаўніцкі інстытут быў пераўтвораны ў "Магілёўскі Педагагічны Інстытут" – вышэйшую навучальную ўстанову з чатырохгадовым тэрмінам навучання. У 1919 г. ён стаў інстытутам народнай адукацыі з больш шырокім профілем выпускаемых спецыялістаў, а летам 1921 г. быў пераўтвораны ў Практычны Інстытут Народнай Адукацыі, які праіснаваў да 1923 г.

Інстытут у гэты час быў не толькі адукацыйнай, але і выхаваўчай установай. Вышэйшыя органы народнай адукацыі сачылі за тым, каб студэнты адпавядалі "патрабаванням пралетарскага будаўніцтва". На "губернскім з'ездзе 1921 г. па народнай адукацыі" ў Гомелі ў сакавіку-красавіку 1921 г. старшыня Савета ІНА Я. В. Бычкоў вымушаны быў распавядаць аб тым, што студэнты "ў значнай ступені выхадцы з пралетарскай і сялянскай масы, шчыльна звязаны з ёй і нясуць сваю справу служэння пралетарскай масе шляхам дакладаў на палітычныя, рэлігійныя і літаратурныя тэмы ў сценах і па-за сценамі інстытута", што інстытут уважліва "сочыць за развіццём ідэй аб працоўнай школе" і г. д. На гэтым з'ездзе дэлегаты ставілі перад ІНА задачу паляпшэння работы студэнцкага клуба і арганізацыі інтэрната, ва ўмовах якога "асновы камуністычнага светапогляду могуць быць прышчэплены студэнтам усяго лягчэй". Разглядалася пытанне аб пошуку лектараў-камуністаў. З мэтай марксісцкага выхавання студэнтаў у ІНА былі ўведзены агульныя прадметы: гісторыя і тэорыя навуковага сацыялізму, савецкая канстытуцыя, палітычная эканомія, вучэнне аб адзінай працоўнай школе. Але ваяўнічага адарвання некамуністычнай ідэалогіі па

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

вялікім рахунку яшчэ не было. Пазначаныя прадметы выкладалі не камуністы, бо з ліку апошніх “не знайшлося жадаючых іх чытаць”. У кастрычніку 1920 г. Савет абмеркаваў пытанне аб увядзенні ў якасці неабавязковага прадмета “Гісторыі хрысціянства”. Але з-за адсутнасці вольных памяшканняў яно было адкладзена. [2, с. 45 – 46] У студэнтаў яшчэ былі калядныя і велікодныя вакацыі. Адначасова з рэвалюцыйнымі адзначаліся і рэлігійныя святы.

Стварэнне працаздольнага калектыву выкладчыкаў, які адпавядаў бы статусу інстытута, было адной з найбольш цяжкавырашальных праблем жыцця інстытута таго часу. У ІНА выкладалі доктар навук С.В. Марголін, кандыдат эканамічных навук М.В. Юдзеніч, а вось кандыдаты багаслоўя У.М. Тычынін і В.П. Сакалоў свае навуковыя ступені ўжо не адзначаліся ў анкетах і даведках.

Такім чынам, менавіта ў першае дзесяцігоддзе дзейнасці нашай навучальнай установы, у выніку грамадска-палітычным трансфармацыі грамадства пасля рэвалюцыі 1917 г., рэлігійная адукацыя была заменена на атэістычную прапаганду, хаця апошняя ў інстытуце яшчэ і не набыла форму ваяўнічага атэізму.

**Літаратура**

1. Гісторыя Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта (1913 – 1940 гг.): дакументы і матэрыялы / аўт.-склад.: А.Р. Агееў, К.М. Бандарэнка, В.П. Клімковіч; пад агульн. рэд. К.М. Бандарэнкі. – Магілёў: МДУ імя А.А. Куляшова, 2008. – 216 с.

2. Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А.А. Куляшова: мінулае і сучаснасць / А.Р. Алееў, В.А. Бандарэнка, С.А. Бандарэнка, П.Г. Рабзонаў і інш.; Пад рэд. М.І. Вішнеўскага – Магілёў: МДУ імя А.А. Куляшова, 2003. – 260 с.

3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Фонд 2258. – Воп. 1. – Спр. 8.

4. НАРБ. – Спр. 13.

5. НАРБ. – Спр. 28.

6. НАРБ. – Спр. 37.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова